УДК 34(091) 4Беи

# СКАСАВАННЕ ШЛЯХЕЦКАГА ШЛЮБУ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ (XVI СТ.)

*Н.А. СКУЛАК*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Разглядающа прычыны і ўмовы скасавання шляхецкага шлюбу ў Вялікім Княстве Літоўскім паводле кананічнага і свецкага права. Параўноўваюцца нормы па «разводех малженьских» у праваслаўнай і каталіцкай цэркваў.*

Для грамадства Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) у XVI ст. характэрна новае стаўленне да сацыялагічных і тэалагічных праблем шлюбу. Аснова гэтага стаўлення - гуманізм як сістэма поглядаў з яго антрапацэнтрычнай накіраванасцю. У адрозненні ад сярэдневяковых тэалагічных прыярытэтаў бясшлюбнасці і аскетызму, сям'я трактавалася як найважнейшы грамадскі інстытут. Таму шлюбна-сямейныя адносіны знаходзіліся пад юрысдыкцыяй свецкага і кананічнага права. Шлюб як таінства аберагала царква, а як адзін з важнейшых інстытутаў грамадства - дзяржава. Асноўнай крыніцай праваслаўнага кананічнага права ў ВКЛ была Кормчая кніга - зборнік апостальскіх і саборных правіл, законаў свецкай улады, што тычыліся царкоўнага суда (напрыклад Статут Яраслава) і іншых матэрыялаў, большая частка якіх была запазычана з Візантыі. Крыніцай катапіцкага кананічнага права з'яўляўся Corpus juris canonici, а з 1563 г. - пастановы Трыдэнтскага сабору. Свецкае права рэгулявапа шлюбныя дачыненні пры дапамозе Статутаў ВКЛ. У кананічным і свецкім праве праблема скасавання шлюбу разглядалася па-рознаму.

Хрысціянскае вучэнне адносіла сужэнцкі саюз да святых і адвечных паняццяў. Абранне шлюбу не лічылася абавязковым для хрысціян, але калі ён абіраўся, то існаваў не толькі для задавальнення асабістых патрэб, але і нёс у сабе ідэю маральнага абавязку чалавека. Цяжкасці сужэнства не з'ўляліся падставай для скасавання шлюбу, а, наадварот, павінны былі надаваць яму дадатковы сэнс. Згодна з хрысціянскай мараллю, шлюб спыняўся са смерцю аднаго з сужэнцаў: «Что бог сочетал, того человек да не разлучает» (Матф. 19.6) [1, с. 4]. Ідэал хрысціянскага шлюбу - абсалютная манагамія, выключаўшы другі шлюб. Але рэчаіснасць не адпавядала ідэальнай форме сужэнства. Таму, паблажліва ставячыся да немачы чалавечай, хрысціянскі закон дазваляў пасля смерці аднаго з сужэнцаў абіраць новы шлюб: па словах апостала Паўла, «жена связана законом, доколе жив муж её; если же муж её умрёт, свободна выйти за кого хочет, только в Господе» [2].

Хрысціянскі шлюб з'яўляўся неразрыўным пры жыцці супружнікаў, за выключэннем выпадкаў пералюбу. Гасподзь адказваў фарысеям, якія пыталіся ў яго, ці па ўсялякай прычыне дазваляецца скасоўваць шлюб: «Но я говорю вам: кто разводится с женою своею не за прелюбодеяние и женится на другой, тот прелюбодействует; и женившийся на разведённой прелюбодействует» (Матф. 19.9) [2]. Але з палажэнняў Евангелля ад Маісея вынікала магчымасць спынення шлюбу пры жыцці мужа і жонкі з дапамогай «разводнага ліста» [1,с. 4]. Тэта выкарыстала праваслаўная царква і пры наяўнасці строга вызначаных прычын дапусціла скасаванне шлюбу. Каталіцкае духавенства лічыла развод недапушчальным.

Такім чынам, акрамя смерці аднаго з супружнікаў і адмены несапраўднага шлюбу, у праваслаўнай царкве яшчэ адной падставай для спынення шлюбу з'яўляўся развод - скасаванне сапраўднага сужэнства царквой або кампетэнтнай грамадзянскай уладай. У эпоху Юстыніана (навэла 117) былі вызначаны прычыны да разводу. Менавіта адсюль бярэ пачатак уся канцэпцыя падставаў для скасавання шлюбаў, якая была ўспрынята кананічным правам праваслаўя [3, с. 74]. Вывучыўшы заканадаўства і актавыя матэрыялы па дадзенаму пытанню, можна вылучыць прычыны развода, звязаныя з пакараннем і забаронай шлюбу для вінаватага боку і прычыны развода, не звязаныя з віной супружнікаў.

Асноўнай падставай для спынення шлюбу паводле канону ўсёй усходняй царквы прызнаваўся пералюб. Хрысціянскае вучэнне пра сужэнства супярэчыла нормам рымскага права. Яно не адразу пачало набіраць моц нават пасля хрысціянізацыі Візантыйскай імперыі. Евангелле патрабавал'а вернасці не толькі ад жонкі, але і ад мужа. Але паколькі такое патрабаванне было занадта высокім для тагачаснага грамадства, царкоўны суд вымушаны быў лічыцца з традыцыямі грамадзянскага права. Таму царкоўная практыка па-рознаму вызначала пералюб мужа і жонкі. Муж лічыўся пералюбнікам толькі тады, калі меў інтымную сувязь з замужняй жанчынай. Такім чынам, юрыдычна ён быў вінаваты не перад сваёй жонкай, а перад іншым мужам. Сувязь жанатага мужчыны з незамужняй жанчынай магла асуджацца толькі з пункту гледжання маралі. Жонка прызнавалася перапюбніцай у кожным выпадку ўступлення ў сувязь з мужчынам, незалежна ад таго жанаты ён ці не [4, с. 117]. Каб скасаваць шлюб з прычыны здрады аднаго з сужэнцаў, неабходна было даказаць факт чужаложаства.

Падставамі для разводу лічыліся выпадкі, якія можна было разглядаць як аналогію сямейнай нявернасці або смерці. Напрыклад, аналогіяй пералюбу лічыўся начлег жонкі па-за межамі свайго дома, што стварала пагрозу для яе гонару, або наведванне без суправаджэння мужа розных ігрышч днём ці ноччу [5, с. 192]. Адсутнасць без вестак аднаго з сужэнцаў - падстава для скасавання шлюбу пры верагоднасці дапушчэння яго смерці. Ёю шырока карысталіся ў княстве. Напрыклад, у 1580 г. Няліда Тышкоўна абвясціла, што некалькі год назад яе муж бясследна знік. Яна, «не хотячы мешкать во блуде» абрала шлюб з другім чалавекам. Тэта прызналі і духоўны, і свецкі суд [6, с. 326].

Несапраўдным лічыўся новы шлюб пры наяўнасці нескасаванага папярэдняга шлюбу. За дваяжэнства муж нёс грашовае пакаранне і атрымліваў наказ жыць з першай жонкай: «Молодую поняти в дом церковный, а со старою жити» [5, с. 190]. Так, у 1540 г. прадпісанне вярнуцца да законнай жонкі атрымаў Мацей Несцяровіч, калі праз два гады пасля вянчання пачаў жыць з іншай жанчынай [4, с. 69].

Адной з падставаў для скасавання шлюбу была прыналежнасць да розных веравызнанняў. Свяшчэннае Пісанне прадпісвала «отлучить себя от жён иноплеменных» [1, с. 5]. Прывілей Ягайлы ад 22 лютага 1387 г. увогуле забараніў шлюбы католікаў з праваслаўнымі [7, с. 63]. Але дадзенае прадпісанне часта ігнаравалася, пра што сведчыць акруговая вялікакняская грамата ад 7 снежня 1548 г. аб забароне ўступаць у шлюб і сужыццё з іншаверцамі: «...многие невесты мужов своих отпускаючи свои воли вживают, а не в законе мешкають, и, будучи хрестьянки, с жидами, с турки и татары живуть» [6, с. 20]. Для грамадства Вялікага Княства Літоўскага характэрны фенамен «радавой біабрадавасці», калі ў адной сям’і былі вернікі розных канфесій, але варожасць на гэтай глебе адсутнічала.

Падставамі для разводу былі непаведамленне жонкай мужу пра падрыхтаваны замах на ўладу і жыццё манарха або на жыццё свайго супружніка, а таксама непасрэдная падрыхтоўка гэтага замаху [5, с. 192].

Яшчэ адна прычына скасавання шлюбу - няздольнасць мужа да сужэнцкага жыцця на працягу трох год або хвароба праказай [5, с, 175].

Выбранне епіскапам таксама прадугледжвала спыненне сужэнцкага жыцця. Так, у 1581 г. будучы епіскап Холмскі Леонцій, каб атрымаць тэты сан, вымушаны быў скасаваць шлюб з Ганнай Пяжэцкай і пасяліцца ў манастыры [8, с. 210].

Такім чынам, праваслаўнае кананічнае права прадугледжвала значную колькасць прычын для прызнання шлюбу несапраўдным і яго скасавання. Але ў Статуце Яраслава, акрамя «кодэксу скасаванняў шлюбу», разглядаліся выпадкі, якія не маглі быць падставай для спынення шлюбу, што звязана не толькі з умацаваннем інстытуту шлюбу, але і з маральным вучэннем царквы. Напрыклад, мужу забаранялася разрываць шлюб з жонкай без віны з яе боку, прадугледжвалася грашовае пакаранне за спыненне шлюбу па ўзаемнай згодзе [5, с. 175]. У свой час на тэрыторыі Візантыі існаваў divitorum ex consensu (развод паводле згоды), прызнаны 140-й навэлай імператара Юстыніана II ад 566 г. [9, с. 218]. У далейшым «Намаканон 14 тытулаў», які з 920 г. стаў афіцыйным кананічным зборам, і сучасныя яму імператарскія зборы («Прахірон», «Эпанагога», «Базілікі») займалі пазіцыю абмежавання разводаў. Ян Комнін у XII ст. канчаткова забараніў разводы на падставе ўзаемнай згоды [9, с. 218]. У царкоўным заканадаўстве дадзеная норма выкладзена ў 87-м Правіле Трульскага сабора [2]. Пазней яна была ўспрынята і Статутам Яраслава.

Значная колькасць актавых матэрыялаў сведчыць пра парушэнне кананічнага права, нярэдка самімі духоўнымі асобамі. Так, у 1540 г. мітрапаліт скасаваў шлюб Багдана Хадкевіча без названых вышэй падстаў - за растрату жонкай маёмасці мужа [4, с. 242]. У 1545 г. Таміла Гітаўтоўна скардзілася каралю, што архіепіскап Полацкі Сімяон замест тага, каб «повстягнуть» яе мужа (сына мітрапаліта) за пабоі жонкі, «не подле обычаю христианского... её разлучил... и другую жону, сестричну свою властную, поняти дозволил» [11, с. 1]. У 1589 г. выйшла акруговая грамата канстанцінопальскага патрыярха Іерэміі літоўскім епіскапам пра пазбаўленне сану святароў-дваяжэнцаў і вымову, што пінскі епіскап Леонцій такіх у свёй епархіі ўтаіў [12, с. 21]. Такім чынам, нягледзячы на ўсебаковую нармаванасць шлюбна-сямейных адносін кананічным правам, мелі месца і парушэнні. Звязана гэта з заняпадам аўтарытэту праваслаўнай царквы ў ВКЛ ў канцы XVI ст. Правы і прывілеі праваслаўнай царквы былі юрыдычна замацаваны (дзяржава брала на сябе абавязак «як рымскага, так і грэцкага веравызнання не праніжаць, не абмяжоўваць і цалкам зберагаць») [13, с. 58]. Але гістарычны аналіз тагачасных падзей і дакументаў паказвае фармальны характар такога становішча праваслаўнай мітраполіі. Кіеўская мітраполія мала ўвагі ўдзяляла адукацыі праваслаўнай моладзі, падрыхтоўцы кадраў для царквы. Сучаснікі з болем адзначалі, што ў праваслаўныя святары ідзе «людское смецце», галоднае і неадукаванае, тыя, каго хутчэй можна сустрэць у карчме, чым у царкве [13, с. 61]. Акрамя таго, вялікі князь, выкарыстоўваючы так званае права «надання хлябоў духоўных» і «будучы надаўцам і абаронцам усіх касцёлаў і цэркваў», парушаючы звычаі праваслаўнай царквы, бярэ на сябе абавязак прызначаць (замест папярэдняй практыкі зацвярджаць) епіскапаў на кафедры [13, с. 59]. Правілам стала атрыманне епіскапства ці архімандрыі за грошы. Бывала, калі людзі атрымлівалі епіскапства па пратэкцыі і не спяшаліся прымаць духоўны сан, а гадамі кіравалі епархіямі, застаючыся свецкімі асобамі. Таму не

дзівам становіцца пашырэнне свецкага элементу ў царкоўных судах. Варта адзначыць, што мітрапаліты не вельмі розніліся сваімі паводзінамі ад шляхты і падпарадкаваных ім архіерэяў. Так, галіцкая шляхта пісала да мітрапаліта Анісіфара Дзевачкі: «У святых манастырах замест ігуменаў і братчыкаў жывуць ігумены з жонкамі, дзецьмі і валодаюць і кіруюць цэрквамі Божымі» [13, с. 60]. А ў 1589 г. на Тэрнопальскім саборы канстанцінопальскі патрыярх Ерамія пазбавіў кафедры самога мітрапаліта А. Дзевачку за двaяжэнства [13, с. 60]. Адыходу ад догмаў праваслаўнай царквы спрыяла і Рэфармацыя. Дадзеныя факты тлумачаць парушэнне праваслаўнага кананічнага права і здзяйсненне духоўнымі асобамі разводаў без падстаў.

Каталіцкі касцёл лічыў недапушчальным скасаванне таінства шлюбу, якое завяршалася сужэнцкім жыццём. Нават пералюб і працяглая адсутнасць аднаго з сужэнцаў не былі падставамі для скасавання шлюбу [14, с. 20]. Толькі смерць аднаго з супружнікаў магла даць свабоду абрання паўторнага шлюбу. Інакш кажучы, нават у выпадку спынення сужыцця хрысціянскія муж і жонка заставаліся звязанымі сапраўдным сужэнствам, «и если их ссоре не видно конца, они, подобно девственникам, обрекаются на целомудренную жизнь» [14, с. 15]. Але затое касцёл павялічваў колькасць перашкод для абрання шлюбу, невыкананне якіх вяло да прызнання яго несапраўдным. 15 ліпеня 1563 г. тэмай абмеркавання Трыдэнтскага сабора стала таінства шлюбу. У дванаццаці канонах было асуджана двaяжэнства і скасаванне шлюбу, падкрэслена права касцёла «станавення перашкод малжэньскіх» [15, с. 173]. Вылучаліся наступныя перашкоды да шлюбу: умыкание нявесты, памылка, рознасць рэлігіі і стану, сваяцтва, наяўнасць папярэдняга шлюбу, грамадскія інтарэсы і інш. [15, с. 203].

Такім чынам, заходняя царква прапаведвала непарыўнасць шлюбу, але шырока выкарыстоўвала сепарацыю - «адлучэнне ад стала і ложа» без права ўступлення ў новы шлюб. Такое рашэнне прымалася з наступных прычын: пералюб, замах на жыццё сужэнца, інфекцыйная хвароба, уступленне ў манаства, нежаданне сужэнца жыць з асобай нехрысціянскага веравызнання [4, с. 116]. У праваслаўі пасля разводу дазвалялася ўтвараць новае сужэнства (у залежнасці ад прычыны скасавання шлюбу або ад маёмаснага становішча аднаго з супружнікаў).

У свецкім заканадаўстве дачыненні аб скасаванні шлюбу рэгуляваліся Статутамі ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. Статут 1588 г. упершыню рэгламентаваў адносіны паміж мужам і жонкай пры разводзе, тым часам як папярэдні Статут толькі ўзгадваў пра скасаванне шлюбу як пра форму яго спынення. У Статуце 1588 г. гэтаму пытанню прысвечаны артыкулы 20, 22 раздзела V [16, с. 223 - 224]. Яны заснаваны на нормах кананічнага права, па сутнасці паўтараюць іх у частцы гіпотэзы і дыспазіцыі, але дапаўняюць у частцы санкцыі [4, с. 118].

Так, Статут яшчэ раз пацвярджаў кампетэнцыю царквы па «разводех малженьскйх» [16, с. 223]. Прадугледжвалася скасаванне шлюбу як несапраўднага ў тым выпадку, калі бралі шлюб асобы, што знаходзіліся ў блізкіх ступенях роднасці (чатыры пакапенні, а таксама нявесткі і дзядзіныя) [16, с. 224]. Калі сужэнцы ведалі пра гэтую роднасць, то дзеці ад такога шлюбу лічыліся бенкартамі (незаконнанароджанымі). Акрамя таго, ужываліся сур'ёзныя маёмасныя санкцыі: муж і жонка палову сваіх маёнткаў трацілі на карысць дзяржавы [16, с. 224]. Калі бакі ажаніліся, не ведаючы пра роднасць, шлюб скасоўваўся, але вышэйназваныя санкцыі не выкарыстоўваліся. Так, яшчэ ў 1518 г. кіеўскі мітрапаліт Іосіф, даведаўшыся, што полацкі баярын Яцко Сеньковіч абраў шлюб з удавой свайго брата, даў яму «разводны ліст», але дзяцей прызнаў законнанароджанымі, бо нарадзіліся яны ад царкоўнага шлюбу (пасля вянчання). Свецкія ўлады прызналі правы дзяцей на маёмасць бацькоў [17, с. 65]. Як бачна, дадзеная норма змянілася на працягу XVI ст. і стала больш суровай. Магчыма, тэта было звязана з частымі яе парушэннямі.

Несапраўдным прызнаваўся шлюб пры існаванні нескасаванага папярэдняга [16, с. 225]. Відавочна, што гэтае палажэнне запазычана з кананічнага права. Але санкцыі ў свецкага закона былі больш суровыя: Статут 1588 г. за двaяжэнства караў смерцю [16, с. 225]. Смерцю караўся і пералюб [16, с. 345]. Аднак разгледжаныя актавыя матэрыялы не пацвярджаюць выкарыстанне такіх жорсткіх мераў супраць парушальнікаў [6, 8, 11, 12, 18].

Дзейснай падставай для скасавання шлюбу была дзяржаўная здрада. Жонка, якая не ведала пра здраду мужа, захоўвала маёнткі і магла ў другі раз абраць шлюб [16, с. 81].

Такім чынам, падставы для скасавання шлюбу, змешчаныя ў Статуце 1588 г., у асноўным былі запазычаны з кананічнага права. Але трэба адзначыць, што пры скасаванні шлюбу, як і пры ўступленні ў яго, шырока карысталіся звычаёвым правам. У ВКЛ было распаўсюджана скасаванне шлюбу і без падстаў, паводле ўзаемнай згоды, абумоўленай поглядам на шлюб як на свабодную дамову. І. Юхо сцвярджае, што для спынення шлюбу сужэнцам дастаткова было абвясціць аб гэтым перад свецкім або духоўным судом [18, с. 113]. Так, у 1557 г. шляхціч Іван Багушэвіч і яго жонка Марына Кумпелеўна заявілі, што «за частою невзгодою а немилостью в малженьстве нашом... вчинили есьмо себе один другого вольными... на што есьмо межо собой и листы ростанья своего один другому дали под зарукою господарскою» [10, с. 414]. Як бачна, афіцыйная ўлада прызнала тэты факт.

Развод паводле згоды бакоў часта адбываўся пры ўдзеле арбітраў, якім у актах давалася найменне «przyjaciól obopolnych» [9, с. 225]. Яны мелі немалую ролю ў справе разводу, асабліва пры вызначэнні маёмасных умоў. Так, пры скасаванні шлюбу Сямёна Храптовіча і Раіны Русінаўны «заставене и угода стала ся промежку нас... через власную особу... князя Федоровича Корецкого, старосты луцкого, браславского, и винницкого, ...князя Остаффа Сокольского подсудка земского, а... пана Михайла Коротенского писара земского луцкого..., приятелей наших зобапольных» [9, с. 225]. Выступленне ў ролі арбітраў дастойных людзей сведчыла, што шляхецкае грамадства лічыла развязанне шлюбу з'явай, якая не абражае гонару ніводнага з бакоў. У 1581 г. ва Уладзіміра-Валынскі гродскі суд трапіла дамова пра скасаване шлюбу Януша Глінскага і Катарыны Крык. Неўзабаве пасля выхаду замуж Катарына кінула мужа і пачала жыць з нейкім Янам Шчаўрскім. Кінуты муж з дапамогай стараставых пахолкаў зняволіў жонку, а за пералюб ёй і каханку пагражала кара смерці. Але па просьбе жонкі і «едначоў» Глінскі згадзіўся на развод. Супружнікі вызвалілі адзін аднаго, дазваляючы іншы шлюб [9, с. 227]. Тэта пры тым, што па Статуце за пералюб пагражала пакаранне смерцю, а кананічнае права катэгарычна забараняла шлюб паміж чужаложнікамі. Як бачна, урад, сужэнцы і грамадская думка («едначы») лічылі, што дастаткова згоды бакоў для скасавання старога шлюбу і надання ў далейшым чужаложнаму стасунку статусу легальнага сужэнскага саюзу.

Зразумела, што становішча жанчыны ў ВКЛ, хоць і далёкае ад становішча мужчыны, заставалася адносна добрым. У разводных актах паводле ўзаемнай згоды звычайна агаворвалася, што бакі могуць уступаць у новыя шлюбныя саюзы без ніякай перашкоды з боку разведзенага сужэнца. З такіх актаў бачна роўнасць правоў абодвух полаў і ў ініцыятыве разводу, і ў праве даць згоду на яго. Такая асаблівасць пры скасаванні шлюбаў на тэрыторыі ВКЛ можа сведчыць пра больш незалежнае ў параўнанні з Маскоўскай дзяржавай грамадскае і юрыдычнае становішча жанчыны. У Маскоўскай Русі ініцыятыва скасавання шлюбу знаходзілася выключна ў руках мужчыны, таму распаўсюджанай формай разводу, асабліва сярод вышэйшых слаёў грамадства, былі фактычна прымусовыя пастрыжыны жонкі. Праз яе манаскія абеты муж вызваляўся ад путаў старога шлюбу і мог абраць новы.

Афіцыйна скасоўваць шлюбы мог толькі мітрапаліт. Але ў ВКЛ праваслаўнае духавенства падпарадкоўвалася свецкім панам, а яны разглядалі царкоўныя інстытуты як прыналежнасць сваіх маёнткаў, што выяўлялася у праве свецкіх феадалаў распараджацца царкоўнымі пасадамі і падпарадкаваным ім духавенствам паводле сваёй волі [9, с. 248]. На пачатку XVII ст. уніяцкі пісьменнік Леў Крэўза бачыў такія дачыненні паміж феадалам і святаром: «У Канстанцінопалі імператар, на Маскве сам Вялікі князь, а ў нашых краях кожны шляхціч, што мае папа, уладарыць над ім як удумае» [9, с. 284]. Акрамя таго, свецкія ўраднікі былі зацікаўлены ў доходах ад разводных спраў, і таму прымалі ўдзел у скасаванні шлюбаў (асабліва паводле ўзаемнай згоды), нягледзячы на існаванне кананічнага права і падтрымку яго манархам. Так, у 1499 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр выдаў даравальную грамату праваслаўнаму духавенству на права «судити и радити, и уси дела духовный справовати» [19, с. 2]. Гэтае палажэнне неаднаразова пацвярджалі і наступныя князі. Актавыя матэрыялы сведчаць аб парушэнні гэтых пастаноў. Напрыклад, у 1544 г. вялікі князь абвінаваціў слуцкіх і копыльскіх ураднікаў Алены Слуцкай у тым, што з яе дазволу яны «мужов с жонами роспускают и роспусты берут, а до права и до казни духовной их не выдают» [20, с. 397]. У акруговай каралеўскай грамаце 1592 г. у чарговы раз забаранялася літоўскім свецкім саноўнікам, вотчыннікам і ўраднікам умешвацца ў духоўную «расправу» (суд духоўных асоб), скасоўваць вянчаныя шлюбы, прадпісвалася перадаваць усе гэтыя справы мітрапаліту і епіскапам [12, с. 41]. Такім чынам, ступень падпарадкаванасці праваслаўнай царквы свецкім чыннікам была даволі значнай. Ю. Бардах звязвае гэта з пануючым становішчам каталіцкай царквы, якое аслабляла праваслаўных іерархаў і клір, у значнай меры падпарадкоўвала іх праваслаўным феадалам [9, с. 249]. Можна меркаваць, што такая сітуацыя склалася пасля заключэння Люблінскай і Берасцейскай уній. А ў папярэдні перыяд (з 50-х гадоў) значны ўплыў на светапогляд грамадства, каталіцкую і праваслаўную царкву аказвала Рэфармацыя. Пратэстанты разглядалі сужэнства як свабодную дамову, якая можа быць скасавана з узаемнай згоды. У пачатку XX ст. даследчык Рэфармацыі ў Беларусі В. Пліс пісаў: «Трэба прызнаць бясспрэчным той факт, што на пачатку 60-х гадоў XVI ст. кальвінскае вызнанне знаходзілася на ўзроўні пануючага веравызнання і пачынала моцна ўкараняцца тут» [21]. Шляхта як каталікі, так і праваслаўныя, масава пераходзілі ў кальвінізм, а месцічы актыўна прымалі вучэнне Лютэра. Калі перад Рэфармацыяй у Вялікім Княстве налічвалася каля 700 каталіцкіх парафіяў, то ў 1576 годзе ва ўсёй Жамойці, каталіцкім рэгіёне княства, засталося ўсяго 6 каталіцкіх святароў, а ва ўсёй краіне каталікі складалі толькі тысячную частку насельніцтва [21]. Шляхта ў Вялікім Княстве Літоўскім, у адрозненні ад многіх краін Еўропы, а таксама Расіі, складала каля 10 % насельніцтва (для параўнання: шляхецкі стан у Францыі налічваў каля 1,5 % грамадства), і ў пераважнай большасці яна стала пад сцягі Рэфармацыі [21]. Такім чынам, пад уплывам Рэфармацыі погляд на шлюб у ВКЛ стаў больш свецкім.

У адрозненні ад духоўнага, свецкае права рэгулявала і маёмасныя вынікі скасавання шлюбу. Яны былі звязаныя з вінаватасцю або невінаватасцю бакоў пры разводзе. Калі ў спыненні шлюбу вінаваты быў

муж, ён страчваў сваю маёмасць, запісаную жонцы ў якасці вена, калі вінаватай аказвалася жонка - яна губляла на карысць мужа свой пасаг і яго маёмаснае забеспячэнне. Пры наяўнасці ад шлюбу дзяцей, маёмасць вінаватага ў скасаванні шлюбу сужэнца пераходзіла ў іх уласнасць [16, с. 223]. Калі шлюб быў скасаваны без прызнання віны мужа і жонкі, ніхто з бакоў не нёс маёмасных страт [16, с. 223].

З вышэйсказанага бачна, што скасаванне шлюбу было звычайнай справай у шляхецкага саслоўя ВКЛ. Кананічнае права ўсходняй і заходняй цэркваў мелі розныя погляды на скасаванне шлюбу. Праваслаўным дазвалялася пры наяўнасці строга вызначаных прычын скасоўваць стары і абіраць новы шлюб. Заходняя царква не дапускала такой магчымасці. Праваслаўнае кананічнае права ўсебакова рэгламентавала працэс скасавання шлюбу. Але царкоўная мараль у XVI ст. па-ранейшаму ў асобных момантах разыходзілася з традыцыямі і звычаямі грамадства, пра што дастаткова пераканаўча сведчаць актавыя матэрыялы. З-за аслаблення пазіцый праваслаўнай царквы ў ВКЛ пасля заключэння Люблінскай уніі, павелічэння свецкага ўплыву на яе шырока распаўсюдзіліся выпадкі парушэння царкоўных законаў.

У свецкім праве нормы па скасаванню шлюбу ўпершыню былі замацаваны Статутам 1588 г. Ён удакладніў кампетэнцыю духоўнага і свецкага судоў пры вызначэнні наступстваў разводу. Духоўны суд выносіў толькі пастанову аб скасаванні шлюбу і тлумачыў яго прычыны ў паведамленні свецкаму суду. Свецкія ўлады вызначалі маёмасныя вынікі разводу. Але актавыя матэрыялы сведчаць пра парушэнні шлюбна-сямейнага права духоўнымі асобамі, пра скасаванне шлюбаў свецкімі ўладамі. Кіраўніцтва царквы (праваслаўнай і каталіцкай), нягледзячы на падтрымку манарха і свецкіх законаў, няздатна было поўнасцю падпарадкаваць шлюбныя справы духоўнай юрысдыкцыі. Актыўна выкарыстоўвалася звычаёвае права пры наяўнасці пісанага. Той факт, што большасць нормаў па скасаванні шлюбу запазычана Статутам з кананічнага права сведчыць, з аднаго боку, пра імкненне заканадаўцаў да хрысціянізацыі шлюбных адносін, іх рэгламентацыі, з другога - пра сцвярджэнне прыярытэту свецкай улады над духоўнай. Тэта прыкмета станаўлення новай, раннебуржуазнай свядомасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. О христианском браке и об обязанностях мужа и жены. Учение Иоанна Златоуста. - М., 1990. - 30 с.
2. Цыпин В. Церковное право /http://www.krotov.Org/libr_min/ts/tsyp4.html#_Toc509901521
3. Черниловский З.М. Римское частное право: Элементарный курс. - М.: Новый Юрист, 1997. - 224 с.
4. Дзербіна Г. Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу. - Мн.: Тэхналогія, 1997. - 172 с.
5. Российское законодательство X - XX вв.: В 9-ти т. - М.: Юрид. лит., 1984. - Т. 1: Законодательство Древней Руси. - 432 с.
6. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. - Вильно, 1915. Т. 39: Акты Могилёвского Магистрата (1578 - 1580 гг.). - 674 с.
7. Лапіцкі М. Праваслаўе ў ВКЛ з часоў панавання Уладзіслава Ягайлы (Магістарская праца для Варшаўскага універсітэту з 1934 г.). - Нью-Йорк: ЗШПА Амерыкі, 1978. - 153 с.
8. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. - Вильно, 1892. - Т. 19: Акты, относящиеся к истории бывшей Холмской епархии. - 405 с.
9. Бардах Ю. Штудыі з гісторыі ВКЛ / Пер. М. Раманоўскага і А. Істоміна; Прадм. Г. Сагановіча. - Мн.: Бібліятэка часопіса «Беларускі гістарычны агляд», 2002. - 459 с.
10. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. - Вильно, 1890. - Т. 17: Акты Гродненского земского суда. - 560 с.
11. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией. - СПб., 1848. ТЛИ: 1544 - 1587 гг. - 316 с.
12. ***Акты,*** относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией. - СПб., 1851. Т. IV: 1588- 1632 гг.-529 с.
13. Харошын М. Праваслаўная царква ў жыцці украінцаў і беларусаў паміж Люблінскай і Берасцейскай уніямі (1569 - 1596) // Спадчына. -2002. - № 5 - 6. - С. 56 - 63.
14. Тышкевич С. Нерасторжимость христианского брака. - Нью-Йорк, 1955. - 56 с.
15. Trydencki sobór // Podr^czna encyklopedya kościelna. - Kraków, 1914. - T. 39 - 40 (S-T-U). - S. 266 - 275.
16. Статут ВКЛ 1588г.: Тэксты. Давед. Камент. - Мн.: Бел. сав. энцыкл. імя П. Броўкі, 1989. -*573 с.
17. Литовская Метрика. Книга 11 (1518-1523).-Вильнюс: Mokslo ir enciklopediju leidykla, 1997.-227с.
18. Юхо И. А. Правовое положение населения Белоруссии в XVI в. - Мн.: Издательство БГУ, 1978. - 143 с.
19. Белорусский архив древних грамот. - М.: Тип. Селивановского, 1824. Ч. 1. - 115 с.
20. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией. - СПб., 1848. Т. II: 1504 - 1544 гг. - 405 с.
21. Акіньчыц С. Залаты век Беларусі / http://txt.knihi.com/bel/zalaty.html